УДК 821.161.3-14

Вуч. М.А. Назарэнка
Навук. кір. Л.М. Дарафейчык, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Табульская сярэдняя школа" Пінскага раёна)

# ДУХОЎНАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ І ВОБРАЗ ЯКУБА КОЛАСА Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

Мэта маёй работы: паказаць, што духоўнае жыццё Якуба Коласа будзе доўжыцца супольна з нашым агульным рухам у сцвярджэнні Беларусі як унікальнай і непаўторнай нацыянальна-гістарычнай каштоўнасці Сусвету. Асоба Якуба Коласа, яго жыццё і дзйнасць – па сутнасці, асобная тэма ў беларускай літаратуры. Пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што толькі ў бібліяграфічным слоўніку "Беларускія пісьменнікі" зафіксавана каля 300 твораў, прысвечаных беларускаму песняру. Пра яго жыццё Сцяпан Аляксандравіч Хусейнавіч напісаў трылогію "Ад роднае зямлі…", "На шырокі прастор", "Крыжавыя дарогі", Максім Лужанін – аповесць "Колас расказвае пра сябе", Алесь Асташонак – бібліяграфічную драму "Іскры ў начы". Рамантычны апаэтызаваны вобраз Музыкі ў апавяданні Змітрака Бядулі з аднайменнай назвай "Музыка" – яскравае ўвасабленне пяснярскага лёсу Якуба Коласа. Якуб Колас і Янка Купала – героі п'есы Васіля Віткі "Шчасце паэта",апавядання Генрыха Далідовіча "Сустрэча" і інш. У галіне паэтычнага эпасу пра нашага знакамітага песняра створаны паэмы "Праводзіны" Максіма Лужаніна і "А ў бары, бары" Антона Бялевіча. Аднак абсалютная большасць твораў на коласаўскую тэму – гэта, зразумела, вершы, частка з якіх увайшла ў зборнік " Нам засталася спадчына" (1982). Лірыка пра Якуба Коласа на сённяшні дзень надзвычай багатая, таму патрабуе навуковага агляду, пэўнай сістэматызацыі і эстэтычнага аналізу.

Духоўнае прыцягненне беларускіх пісьменнікаў да асобы Якуба Коласа і яго паэзіі выявілася яшчэ на пачатку ХХ стагоддзя. І гэта не выпадкова: паэт быў лідэрам, заканадаўцам ідэй, эстэтыкі маладой нацыянальнай літаратуры, творчае станаўленне не аднаго аўтара праходзіла пад дабратворным уплывам ягонай ліры. Каля вытокаў коласаўскай тэмы ў паэзіі знаходзіцца Цішка Гартны – пісьменнік, які спрыяў разгортванню літаратурнага руху, закладваў ідэйна-эстэтычныя асновы развіцця беларускага мастацкага слова. Ён на старонках газеты "Наша ніва" ў 1910 гаду апублікаваў верш "Не хістайся, дуб зялёны…" з прысвячэннем Якубу Коласу.

Найперш гэты твор – сведчанне духоўнай салідарнасці і падтрымкі паэта, які апынуўся за кратамі. Разам з тым, верш Цішкі Гартнага ўспрымаецца і як водгук на Коласавы “Песні жальбы” (1910). Пясняр працы і змагання, як часта называюць Цішку Гартнага, у алегарычнай форме звяртаўся да свайго літаратурнага паплечніка, выказваў упэўненасць у непахіснасці яго духу. У вершы гучаць словы зычыння, апошняя страфа канчаецца заклікам:

Не глядзі пудлівым вокам
На ўзрывы дзікай сілы, –
А ваюй на кожным кроку
За жыццё аж да магілы!.

Абодвух паэтаў – Якуба Коласа і Цішку Гартнага – хваляваў лёс Беларусі, яны не ўяўлялі існавання народа без сацыяльнай і духоўнай свабоды. Коласава лірыка ў “нашаніўскі час” несла ў сабе не толькі матывы смутку і журбы, яна адначасна была выяўленнем мужнага грамадзянскага настрою, адраджэнскага аптымізму, пра што красамоўна гавораць назвы вершаў: “Кіньце смутак”, “Не бядуй!”, “Будзь цвёрды”, “Наша возьме” і інш.

У сілавое поле паэзіі Якуба Коласа трапіў Гальяш Леўчык. Ён выразна заявіў пра сябе зборнікам “Чыжык беларускі” (1912), які элегічным пафасам вельмі сугучны са зборнікам “Песні-жальбы”. У сваёй блізкасці да коласаўскага светаадчування паэт прызнаваўся ў вершы “Не бачыў цябе я ніколі…”:

Коласаўская паэзія магнетычна ўздзейнічала на творчасць многіх нашаніўцаў. Яна дэманстравала высокі ўзровень мастацкасці слова, індывідуальнага паэтычнага майстэрства і тым самым прадвызначала дынаміку развіцця літаратуры, яе галоўныя ідэйна-тэматычныя і стылёва-выяўленчыя арыенціры.

Духоўным паплечнікам  Якуба Коласа на ніве адраджэння беларускай літаратуры стаў Алесь Гарун. Іх творчы шлях пачынаўся ў адзін час на старонках “Нашай нівы”, абодвух звязвалі адданасць нацыянальна-вызваленчай ідэі, глыбокі патрыятызм, дзейснае служэнне роднаму слову. Пра гэтае творчае пабрацімства і еднасць духу Алесь Гарун гаворыць у сваім зборніку “Матчын дар” (1918):

Усе з адной мы выйшлі нівы,
І сейбіт нас адзін кідаў,
І кожан з нас той дзень шчаслівы
У сваёй душы благаслаўляў.

Між радкоў верша “ Усе з адной мы выйшлі нівы…” чуецца гаркота і шкадаванне, бо паэту выпала цяжкае растанне з роднай зямлёй. Лёс песняроў аказаўся розны: царскі рэжым расправіўся з

Алесем Гаруном – ён пад прымусам “у далёкі свет павандраваў”, на катаргу ў Сібір, Якуб Колас, хоць і спазанаў нявольніцкую долю ў астрозе, усё ж пасля на Беларусі, “…узрос на роднай глебе,/Пусціў глыбока карані”. Паэт, адрасуючы твор Якубу Коласу, выказвае словы гонару і веры ў яго творчы плён. Пры звароце з мэтай эмацыйна-экспрэсіўнага выяўлення адносінаў да свайго літаратурнага брата ён ужывае ласкальную форму словаў, эпітэты велічальнага, ушанавальна-ацэначнага характару.

Алесь Гарун шчыра захапляўся асобай Коласа-паэта, радаваўся яго самасцвярджэнню і ўзвышэнню ў літаратуры.

Прыклад Якуба Коласа яскрава пераконвае мяне ў тым, што выдатная асоба ў літаратуры – гэта сапраўдны крэатар духоўнай энергіі, якая запальвае і мацуе сэрцы многіх і многіх дюдзей, натхняе, дае вялікі стымул для ўнутранага жыцця і творчасці. Коласаўская энергетыка не адно дзесяцігоддзе жыватворна ўплывае на паслядоўнікаў і вучняў паэта, зараджае сваімі імпульсамі ўсіх тых, хто прыйшоў на гэтую зямлю беларускім паэтам: “ Мы заўжды шлях кіруем свой/ На тую песню, ад якой/ З зярняці вырас Колас” ( М. Лужанін. “Экзамен”;) Коласаўская “лінія” ў літаратуры – гэта традыцыя народнасці і гуманізму, праўды жыцця, услаўлення красы і велічы роднай зямлі, традыцыя глыбокага нацыянальна-мастацкага выяўлення ў слове, высокай культуры і эстэтыкі творчасці.Асоба паэта-генія – увасабленне духоўнай і мастацкай магутнасці беларускай душы. Імя вялікага песняра Беларусі, як і яго паплечніка Янкі Купалы, зрабіліся сімвалам нашай нацыянальнай і гістарычнай неўміручасці, пра што выдатна гаворыць паэт Мікола Мятліцкі.

Наш беларускі рух, як і шлях літаратуры, працягваецца па “купалаўска-коласаўскай арбіце”.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік: У 6 т. Т. 3. – Мн., 1994.

2. Беларуская літаратура XIX – пачатку XX стагоддзя: Зб. Тэкстаў. – Мн., 1977.

3. Вярцінскі А. Хлопчык глядзіць…: Выбраныя вершы і паэмы. – Мн., 1992.

4. Грачанікаў А. Выбранае. Вершы і паэмы. – Мн., 1993.